# Ордэн

*Міхась Даніленка*

Вясновым днём ішоў я з Максімкам праз гарадскі сквер. Пасвіствалі шпакі. На вяршаліне сухадрэвіны стукаў дзюбай дзяцел. Раптам Максімка крануў мяне за руку:

— Дзед, глядзі.

На пляцоўцы перад памостам, дзе ў летнія вечары граў аркестр, стаяў патлаты[1] хлопец. На дошчачцы, што вісела над раскладным стэлажом са значкамі, было напісана: «Куплю ордэн Айчыннай вайны». Максімку, відаць, вельмі ўразілі словы «куплю ордэн», і ён аж застыў каля стэлажа.

— Ці ж можна купляць святое? — запытаўся я ў патлатага.

Той звысоку акінуў мяне абыякавым позіркам і працадзіў скрозь зубы:

— А твая якая справа?..

Мы пайшлі далей, і я расказаў Максімку, як у вайну армія, у якой я ваяваў, трапіла ў акружэнне. Мы стаялі да апошняга. Шмат маіх аднапалчан загінула. А потым я, палонны, працаваў у каменяломнях[2], уцякаў з канцлагера[3]. Удвух з сябрам прабіраліся мы па заснежаных Альпах[4], а ў далінах уладарыла вясна, пунсавелі кветкі...

Максімка ведаў: дома, у чырвонай скрыначцы, ляжыць мой ордэн Айчыннай вайны другой ступені. І таму пасля доўгага маўчання запытаўся:

— Дзед, а твой ордэн для цябе — святое?

— Святое, унучак, святое, — адказаў я. — Мне нават страшна падумаць, што ён можа трапіць у нечыя сквапныя[5] рукі... Не стане мяне на свеце, ордэн захаваеш ты — як памяць пра дзеда.

Калі мы вярталіся з прагулкі, патлатага хлопца з раскладным стэлажом у скверы ўжо не было. Як след прастыў[6]. І здавалася, што званчэй спявалі берасцянкі і падавала голас жаўна. Нават сонца свяціла ярчэй.

---

[1] *Патлаты* — размоўнае слова пагардлівае. З патламі, кудлаты, калматы.
[2] *Каменяло́мня* — месца распрацоўкі выкапнёвага будаўнічага каменю і іншых горных парод.
[3] *Канцла́гер* — канцэнтрацыйны лагер: месца ізаляцыі зняволеных і ваеннапалонных.
[4] *А́льпы* — горы ў Заходняй Еўропе.
[5] *Сква́пны* — скупы, прагны да багацця.
[6] *Як след прасты́ў* — хто-небудзь бясследна знік, схаваўся.